**В.А. Служэнка**

# З НАЗІРАННЯЎ НАД ЛЕКСІКА-СІНТАКСІЧНЫМ СЛОВАЎТВАРЭННЕМ МІКРАТАПОНІМАЎ ДЗВЮХ ВЁСАК ХОЙНІЦКАГА РАЁНА

Мікратапаніміка – адзін з цікавейшых раздзелаў тапанімікі. Яе вывучэнне – справа цікавая і займальная, яна дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з побытам жыхароў, з прыродна-геаграфічнымі асаблівасцямі пэўнага рэгіёна.

Мікратапонімі Хойніцкага раёна на сёняшні дзень амаль не даследаваны, таму менавіта яны і сталі аб’ектам нашай увагі. Матэрыялам даследавання з’яўляюцца мясцовыя назвы в. Казялужжа і в. Клівы Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Звесткі пра час іх заснавання ў афіцыйных дакументах адсутнічаюць. Вёска Казялужжа сёння з’яўляецца цэнтрам сельскага савета, у які ўваходзяць такія паселішчы, як Загалле, Небытаў, Куравое, Паташня, Загальская слабодка. Назва вёскі ў народзе звязваецца з выразам *казліныя лужы*.

Даўным-даўно, калі на месцы сёняшніх хат і дарог быў пясок і бездарожжа, ішлі праз гэтыя мясціны людзі са статкам коз. Пабылі яны тут пэўны час і рушылі далей. Потым быў вялікі дождж і ўсе казліныя сляды заліло вадою. Хутка пасля гэтага іншыя вандроўнікі трапілі ў наш край і, калі ўбачылі тут так шмат луж у выглядзе казліных капытоў, то і назвалі вёску Казялужжа.

Існуе і іншая версія паходжання назвы вёскі. Так, прафесар В.А. Жучкевіч лічыць, што назва паходзіць ад выразу *казліны луг*. Як бачым, у аснове абедзвюх версій вытворным для назвы з’явілася слова *каза*. Што датычыцца паходжання назвы вёскі Клівы, то ў народзе яго звязваюць са словам *клін*.

Лексіка-сінтаксічны спосаб утварэння мікратапонімаў адносіцца да сінтаксічнага тыпу словаўтварэння. Тут жа выдзяляюцца сінтаксічна-марфалагічны і марфолага-сінтаксічны спосабы. Назвы, утвораныя лексіка-сінтаксічным спосабам–гэта словазлучэнні тыпу “прыметнік + назоўнік”: *Асінаў востраў, Белае балота, Мядзвежы луг*. У функцыі першага кампанента такіх складаных назваў выступаюць прыметнікі:

а) якасныя – *Белае балота*, *Вялікая лаза*, *Дальняя слабада*, *Новыя рэзкі, Бліжняя слабада*;

б) адносныя – *Асінаў востраў*, *Вераб’ёў лес*, *Марозаў груд*, *Мінаў груд, Мядзвежы лог*;

в) прыналежныя – *Дамейнікава мельніца, Каралішын агарод, Проквітаў рог.*

Сярод лексіка-сінтаксічных мікратапонімаў в. Казялужжа і в. Клівы большую частку складаюць назвы, дзе першым кампанентам з'яўляецца якасны або адносны прыметнік. Складаныя назвы з прыналежнымі прыметнікамі ў якасці першага кампанента сустракаюцца рэдка.

Неабходна адзначыць, што ў складаных мікратапанімічных назвах прасочваецца сувязь чалавека з прыродай, яго тып мыслення і здольнасць заўважаць пэўную асаблівасць у кожным урочышчы, няхай то лес ці гай, азярцо ці балота, поле ці сенажаць. Семантычна такія назвы ўзыходзяць да слоў, якія ўказваюць на:

а) памер урочышча – *Вялікая лаза*;

б) час узнікнення – *Новыя рэзкі*;

в) месца размяшчэння – *Бліжняя слабада, Дальняя слабада*;

г) расліннасць краю – *Асінаў востраў*, *Ліпаў востраў*;

д) жывёльны свет – *Вераб'ёў лес*, *Мядзвежы лог*;

е) якасную характарыстыку ўрочышчаў – *Белае балота*, *Гарэлы круг, Калечы рог.*

Такім чынам, складаныя мікратапонімы адлюстроўваюць розныя асаблівасці ўрочышчаў, пры гэтым прыметнік указвае на прыродныя ці іншыя прыметы ўрочышча, а назоўнік – на геаграфічныя асаблівасці.

Варта адзначыць, што з развіццём мовы і агульнай тэндэнцыі да эканомнага маўпення нярэдка здараецца так, што назоўнік страчваецца, а прыметнік субстантывуецца. Такім чынам папаўняецца марфолага-сінтаксічная група мікратапонімаў: *Дубавое, Лапатнае, Ладава.* Такія назвы не маюць той змястоўнасці і інфармацыйнасці, як назвы лексіка-сінтаксічнага спосабу ўтварэння, бо звесткі, якія нёс у сабе назоўнік страціліся. Зразумела, што спачатку патрэбы ў такіх звестках не было, бо прадмет гаворкі быў усім вядомы.

**Н.А. Харошка**

## АФІКСАЛЬНАЕ СЛОВАЎТВАРЭННЕ МІКРАТАПОНІМАЎ ВЁСКІ КУПЯЦІЧЫ ПІНСКАГА РАЁНА

Пінскае Палессе – адзін з цікавейшых і самабытных рэгіёнаў нашай краіны, багаты сваёй гісторыяй, своеасаблівай гаворкай яго жыхароў. Шмат цікавых і арыгінальных паданняў склалі палешукі пра назвы сваіх